Неотправленное письмо

1 верасня – гэта Дзень ведаў, напоўнены сустрэчамі з сябрамі і настаўнікамі, марамі і планамі на будучае.

Але з пэўнага часу радасць гэтага дня асабіста для мяне азмрочваецца веданнем таго, што менавіта 1-ым верасня далёкага 1939 года пачалася самая разбуральная война з гісторыі чалавецтва – Другая сусветная вайна.

22 чэрвеня 1941 года самалёты з чорнымі крыжамі разарвалі мірнае, блакітнае неба над савецкімі гарадамі і вёскамі. У гэты дзень мая родная Беларусь прыняла на сябе галоўны ўдар фашысцкай арміі.

З літаратуры, урокаў гісторыі, класных гадзін я ведаю страшныя лічбы той вайны. 3-ы гады, 1 месяц і 6 дзён беларускую зямлю тапталі каваныя фашысцкія боты. Каля 3-ох мільёнаў загінуўшых, 10,5 тысяч разбураных і спаленых вёсак, 209 разбураных гарадоў, 260 лагераў смерці – вось што прынеслі фашысты на зямлю маёй Радзімы.

Сёння нават уявіць цяжка ўсе жахі вайны. Калі ты жывеш, акутаны любоўю і клопатам, калі над табой блакітнае неба і яснае сонца, то здаецца, што так было заўсёды, і інакш быць проста не можа. І хочацца крыкнуць:

“А, может, не было войны,
И людям всё это приснилось:
Опустошённая земля,
Расстрелы и концлагеря,
Хатынь и братские могилы?
А, может, не было войны,
И мир её себе придумал?
Но почему же старики
Так плачут в мае от тоски?” [2]

Была вайна… Таму і не спяць па начах ветэраны: баліць сэрца, ныюць застарэлыя раны, не даюць спакою ўспаміны… Вайна ўвайшла ў кожны дом, закранула кожную сям’ю, змяніла лёс кожнага чалавека. І сёння кожная беларуская сям’я мае сваю ваенную гісторыю і свайго героя. Ёсць такі герой і ў маёй сям’і: гэта мой прадзядуля Хадасевіч Станіслаў Вікенцьевіч.

І сёння слова “вайна” не выйшла з ужывання. Падзеі, якія адбываюцца ў свеце і зусім блізка з межамі нашай краіны, паказваюць, як лёгка чалавеку і сёння, у 21 ст., ступіць на сцяжынку вайны. Каб не дапусціць войнаў сёння, важна не забываць бессмяротны подзвіг кожнага салдата Вялікай Айчыннай вайны, якія цаною свайго здароўя і свайго жыцця прынеслі нам Вялікую перамогу. І мой прадзядуля – адзін з гэтых салдат.

Сёння я ведаю, што жыву ў мірны час, у тым ліку, і дзякуючы майму прадзядулю Хадасевічу Станіславу Вікенцьевічу.І сёння, у чаканні Дня Перамогі, мне хочацца звярнуцца да майго прадзядулі з пісьмом.

Дарагі прадзядуля!

Я ніколі цябе не бачыла, бо ты пайшоў з жыцця раней, чым я нарадзілася, але ў нашай сям’і беражліва захоўваецца памяць аб табе: твае фотаздымкі,

дакументы, узнагароды.Вось я трымаю ў руках тваё пасведчанне аб нараджэнні, з якога даведваюся,што нарадзіўся ты 8 мая 1908 г. у сям'і простых калгаснікаў Вікенція Уладзіміравіча і Марыі Уладзіміраўны ў маленькай вёсцы Бярозаўка, што ў Мінскім раёне.

Ведаючы з урокаў гісторыі той час, я ўяўляю, у якіх складаных жыццёвых абставінах ішло тваё дзяцінства і юнацтва: гэта і І сусветная вайна, і дзве рэвалюцыі,і Грамадзянская вайна… Але і ў такіх складаных умовах да вайны ты закончыў 7 класаў, працаваў у родным калгасе, дапамагаў бацькам весці гаспадарку.

Калі пачалася вайна, табе было 33 гады. Як і тысячы, і мільёны іншых, ты быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Вось перада мной фотаздымак тваёй роднай Бярозаўкі. Мне бачыцца, як па гэтай дарозе ты адыходзіў на фронт. Цябе праводзіць маці, якая не стрымлівае слёз. А ты махаеш ёй рукою, стараючыся не паказаць, як цяжка і табе. Ніхто не знае, ці ўбачыцеся вы яшчэ…

Усю вайну ты ваяваў радавым у 377 стралковым палку. Я трымаю ў руках фотаздымак, які ты прыслаў родным з фронту. І ў тваім позірку я бачу рашучасць граміць ворага да поўнага яго выгнання зроднай зямлі. Пасля вайны, калі падрасла твая дачушка – мая бабуля, яна з гэтага фотаздымка намалявала твой партрэт.

Восенню 1944 г. ты дайшоў да нямецкага горада Кёнігзберга. Тут баі былі асабліва жорсткія: гэта была агонія фашысцкага рэжыму. У адным з такіх баёў ты быў цяжка паранены аб чым засталася даведка ад 19.04.1945 г.

Каб выратаваць тваё жыццё ўрачам прыйшлося ампутаваць ступню левай нагі. Пасля гэтага дарога на фронт табе была закрыта.Да Вялікай перамогі заставалася 20 дзён…

А вось у маіх руках яшчэ адзін дакумент: бестэрміновае пасведчанне аб вызваленні цябе ад воінскага абавязку, выдадзенае 18 чэрвеня 1945 г. Вайна зрабіла цябе інвалідам І групы. Такой высокай была твая асабістая плата за Вялікую перамогу над ненавісным ворагам.

Па расказах маёй бабулі, тваёй дачкі, пасля вайны, нягледзячы на інваліднасць, ты працаваў з утроенай сілай, дапамагаючы адрадзіць родную Беларусь. Быў брыгадзірам у калгасе, садоўнікам, качагарам, ахоўнікам, нават, пажарным. А вось перада мной твой прафсаюзны білет, выдадзены прафкамам БДУ імя У.І. Леніна". А гэта значыць, што ты працаваў у свой час у самым галоўным універсітэце нашай рэспублікі! Вось перада мной твой фотаздымак тых гадоў. Ты тут больш падобны на прафесара, чым на рабочага.

А тое, што ты - гераічны, пацвярджаюць не толькі расказы маіх родных, але і твае ўзнагароды (на жаль, не ўсе яны захаваліся): ордэн Айчыннай вайны ІІ ступені, юбілейныя медалі "Двадцать лет Победы в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.", "Тридцать лет Победы в Великой Отечественной войне 1941-1945гг.", "60 лет Вооружённых Сил СССР".

Я ганаруся табой, мой прадзядуля! І калі кожны год 9 мая я стаю каля Абеліска Перамогі, вітаючы ветэранаў, мне здаецца, што ў іх калоне ідзеш і ты. Я махаю табе рукой і крычу: "Дзякуй за Перамогу!"

Дарагі прадзядуля!

Я ведаю, што гэта пісьмо ніколі не будзе адпраўлена. Я не кіну яго ў паштовую скрыню, але я пакладу яго ў куфэрак, дзе ляжаць нашы сямейныя рэліквіі. Для будучых пакаленняў…

Ужо 76 гадоў на нашай зямлі пануе мір. Але чым далей мы адыходзім ад ваеннай пары, тым больш значным бачыцца подзвіг людзей, якія падаравалі нам магчымасць марыць, кахаць, радавацца, спадзявацца, адным словам – ЖЫЦЬ!

Але сёння, гледзячы на падзеі, што адбываюцца вакол нас, разумееш, наколькі зыбкі мір, як лёгка чалавеку і сёння ступіць на сцяжынку вайны. І я задумваюся над тым, што трэба зрабіць, каб больш ніколі на нашай зямлі не лілася кроў. Мне знаецца, што самае галоўнае – гэта наша памяць. Пакуль жыве памяць – жыве падзея, жыве чалавек. Памяць не дасць здзейсніцца новаму злачынству. Я не хачу, каб хто-небудзь з маіх родных зноў узяў у рукі вінтоўку. Я хачу, каб усе жылі ў міры і згодзе, і любілі жыццё так, як любіў яго мой прадзядуля.

Годы, сколько б ни шли,
Вечно помнить родной стране.
Всё, что сделали вы
В этой войне, трудной войне,
Страшной войне![1, с.56].

1. Песні пра вайну. – М.: Кампазітар-Санкт-Пецярбург, 2010.
2. Разенбаўм ,А. А может, не было войны…Беларусь сегодня.-2015. – №10